**24.** Сымонка марыў на летніх канікулах стаць рабінзонам. Задумаўся, што лепш выкарыстаць, каб пераплыць глыбокую раку. Самым надзейным палічыў ...

**А)** плот; **Б)** тын; **В)** плыт; **Г)** штыкетнік; **Д)** граблі.

**25.** З прыведзеных слоў выберыце назоўнікі мужчынскага роду, ад якіх нельга ўтварыць адпаведныя назоўнікі жаночага роду.

1) *матрос*; 2) *настаўнік*; 3) *качагар*;
4) *гітарыст*; 5) *электрык*; 6) *патрыёт*.

**А)** 1, 2, 6; **Б)** 1, 3, 5; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 3, 5, 6; **Д)** няма такіх назоўнікаў.

**26.** У якіх словах нельга ўставіць замест кропак літару ***с***?

1) *пя...чаны*; 2) *пя...чотны*; 3) *пагру...чык*;
4) *заро...шы*; 5) *ву...ка*; 6) *ця...ляр*.

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 5; **В)** 1, 4, 6; **Г)** 2, 3, 5; **Д)** 2, 3, 6.

**27.** У якім горадзе ўстаноўлены помнік літары «***Ў»***?

**А)** Мсціслаў; **Б)** Заслаўе; **В)** Нясвіж; **Г)** Полацк; **Д)** Тураў.

**28.** Якое слова-сінонім можна падабраць да выдзеленага словазлучэння ў сказе?

**Над зямлёй незаўважна рассцілаўся *<u>сухі туман</u>*.**

**А)** імшара; **Б)** лівень; **В)** імшанік; **Г)** імгла; **Д)** няма сіноніма.

**29.** Слова ***гута*** з'яўляецца ўстарэлым. Падумайце, якое слова сёння ўжываецца замест яго?

**А)** малаказавод; **Б)** фабрыка; **В)** шклозавод;
**Г)** магазін; **Д)** малатарня.

**30.** Моваведчы тэрмін ***гемінаты*** падразумевае назву ...

**А)** мяккіх зычных; **Б)** цвёрдых зычных;
**В)** зацвярдзелых зычных; **Г)** падоўжаных зычных;
**Д)** падвоеных зычных.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 292 34 01; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by/*

ГА «Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 23500 экз.

Конкурс па беларускай мове
**«БУСЛІК-2006»**

*Чацвер, 26 студзеня 2006 года*

Заданне для вучняў 5-6 класаў

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

**1.** Выберыце назвы беларускіх гарадоў.

1) *Брэст*; 2) *Масква*; 3) *Полацк*; 4) *Віцебск*; 5) *Кіеў*; 6) *Сафія*.

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 2, 3, 4; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 5, 6.

**2.** Якая літара знаходзіцца на апошнім месцы ў беларускім алфавіце?

**А)** а; **Б)** е; **В)** і; **Г)** я; **Д)** ю.

**3.** Які гук не ўтварае склада?

**А)** [о]; **Б)** [а]; **В)** [у]; **Г)** [й]; **Д)** [ы].

**4.** Ёсць літары: 1) *и*; 2) *й*; 3) *у*; 4) *ў*; 5) *і*.
Якія з іх ужываюцца ў беларускім алфавіце?

**А)** 1, 2, 3, 4; **Б)** 1, 2, 4, 5; **В)** 1, 3, 4, 5;
**Г)** 2, 3, 4, 5; **Д)** усе літары.

**5.** У якіх словах трэба ўставіць літару ***у***?

1) *наста...нік*; 2) *канстр...ктар*; 3) *м...зыкант*;
4) *садо...нік*; 5) *цыр...льнік*; 6) *па...шар'е*.

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 2, 3, 5; **В)** 2, 4, 6; **Г)** 3, 5, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**6.** Закончыце прыказку ***«слова не верабей, выпусціш – ...»***
**А)** не пачуеш; **Б)** не ўбачыш; **В)** не даляціш;
**Г)** не запомніш; **Д)** не зловіш.

**7.** Якое спалучэнне з прыведзеных нельга назваць словазлучэннем?
**А)** цікавае апавяданне; **Б)** збіралі грыбы; **В)** шумеў лес;
**Г)** прачытаў выразна; **Д)** сустрэча з сябрам.

**8.** Колькі слоў з дадзеных маюць гук **[т]**?
1) *гарадскі*; 2) *почырк*; 3) *адкуль*; 4) *святло*; 5) *водгук*; 6) *падсеяць*.
**А)** 2; **Б)** 3; **В)** 4; **Г)** 5; **Д)** няма.

**9.** У частках якіх слоў схаваліся лічбы?
1) *адзінокі*; 2) *смачны*; 3) *прасторны*; 4) *прасвет*; 5) *медаль*; 6) *стрыжы*.
**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 6; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 2, 3, 6; **Д)** 2, 5, 6.

**10.** Якія словы правільна падзелены для пераносу?
1) *ве-ся-лосць*; 2) *я-лі-на*; 3) *ад-’езд*; 4) *га-ллё*; 5) *ад-зві-нець*; 6) *на-дзён-ны*.
**А)** усе словы; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 1, 5, 6; **Г)** 2, 3, 5; **Д)** 3, 4, 6.

**11.** Выберыце літары, перад якімі цвёрды зычны [д] змяняецца на мяккі [дз’].
**А)** а, о, у, ы, э; **Б)** я, а, ё, о, ы; **В)** я, ё, ю, і, е, ь;
**Г)** ё, я, ю, і, е, у; **Д)** перад усімі галоснымі літарамі.

**12.** Вызначце род назоўнікаў ***пыл***, ***стэп***.
**А)** пыл – ж. р., стэп – м. р.; **Б)** пыл – н. р., стэп – н. р.;
**В)** пыл – м. р., стэп – м. р.; **Г)** пыл – ж. р., стэп – ж. р.;
**Д)** пыл – м. р., стэп – ж. р.

**13.** Якія назоўнікі з прыведзеных слоў стаяць у назоўным склоне адзіночнага ліку?
1) *славянка*; 2) *вечарам*; 3) *ручаі*; 4) *неба*; 5) *усхліп*; 6) *ракеткі*.
**А)** 1, 3, 5; **Б)** 1, 4, 5; **В)** 2, 3, 5; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 4, 6.

**14.** У народзе пры нагляданні за паводзінамі камароў прагназуюць надвор’е наступнага дня. Калі чакаецца цёплае надвор’е, гавораць: ***«Заўтра будзе цёпла, бо камары таўкуць ...»*** Як трэба закончыць выраз?
**А)** масла; **Б)** кашу; **В)** проса; **Г)** смятану; **Д)** сцяну.

**15.** Аленка спытала ў Сымонкі, як іначай можна назваць ***бярозу***, ***моркву***, ***ружу***, ***кавун***, ***цыбулю***. Хлопчык адказаў, што гэта ...
**А)** з’явы прыроды; **Б)** адзенне; **В)** жывёлы;
**Г)** расліны; **Д)** прылады працы.

**16.** Падлічыце, колькі прыназоўнікаў ужыта ў вершаваных радках беларускага паэта М. Чарняўскага:

*Каля плота з гурбы снегу*
*Нарадзіўся ручаёк.*
*Заіскрыўся і са смехам*
*Ён па вуліцы пацёк.*

**А)** 2; **Б)** 3; **В)** 4; **Г)** 5; **Д)** няма прыназоўнікаў.

**17.** Колькі агульных гукаў у словах ***вясёлы***, ***свята***?
**А)** 0; **Б)** 1; **В)** 2; **Г)** 3; **Д)** 4.

**18.** Да якіх назоўнікаў нельга падабраць прыметнікі ў форме м. роду, адз. ліку?
1) *яблык*; 2) *таполя*; 3) *медаль*; 4) *стэнд*; 5) *вецер*; 6) *гусь*.
**А)** 1, 3; **Б)** 2, 4; **В)** 2, 6; **Г)** 3, 5; **Д)** няма такіх назоўнікаў.

**19.** Вызначце прыметнікі, што абазначаюць матэрыял, з якога зроблены прадмет.
1) *шырокі*; 2) *смелы*; 3) *палатняны*; 4) *кіслы*;
5) *імклівы*; 6) *фарфоравы*; 7) *гліняны*; 8) *фіялетавы*;
9) *шаўковы*; 10) *прэсны*.
**А)** 1, 3, 4, 6; **Б)** 2, 6, 7, 8; **В)** 3, 6, 7, 9; **Г)** 3, 7, 9, 10; **Д)** 4, 7, 8, 10.

**20.** Як правільна сказаць?
**А)** апрануць паліто; **Б)** апрануць пальто; **В)** апрануцца палітом;
**Г)** апранýцца ў паліце; **Д)** апрануцца ў пальто.

**21.** Вызначце прыслоўе месца.
**А)** згарача; **Б)** бягом; **В)** дадому; **Г)** паняволі; **Д)** зімой.

**22.** У якім сказе няма арфаграфічных памылак?
**А)** Дзядуля аддаў яблык унучцы Ніні.
**Б)** Дзядуля адаў яблык унучцы Ніне.
**В)** Дзядуля адаў яблык унучцэ Ніне.
**Г)** Дядуля аддаў яблык унучцэ Ніне.
**Д)** Дзядуля аддаў яблык унучцы Ніне.

**23.** Разгадайце рэбусы і вызначце толькі жывёл.




**А)** 1, 3; **Б)** 2, 4; **В)** 3, 4; **Г)** 3, 5; **Д)** 4, 6.